ботке партий различными эффектами, управляемыми в Midi-режиме. В ней можно управлять банками данных инструментов основных форматов. Программа распознает Midi-аккорды в реальном времени, гармонизуя темы с клавиатуры. Преимуществом программы «Band-in-a-Box» выступает создание шаблонов собственных стилей, представлением аранжировки в виде нотной партитуры с возможностью ее распечатки, сопровождая поэтическим текстом.

В настоящее время для развития культуры музыкального восприятия беременных студенток преподавателю для проведения музыкотерапевтических занятий с беременными женщинами-студентками необходимы:

- опыт деятельности музыкального звукорежиссера при создании каталога музыкальных программ для молодых мам;
- знание музыкальных компьютерных программ и их функций;
- искусствоведческие знания и др.

Таким образом, деятельность педагогического коллектива по развитию культуры музыкального восприятия беременных студенток концентрируется в студии звукозаписи при совмещении умений звукорежисера, звукооператора, звукотехника, программиста, аранжировщика, звукового дизайнера. Создание музыкальной студии в вузе для реализации проекта «Беременность и музыка» предполагает наличие аппаратуры, компьютера со звуковой мощностью, комплекта программного обеспечения, позволяющих работать с Midi, производить запись живых инструментов, финальный мастеринг и др. Компьютерные программы «Final», «Nero», «Hit Song Science», «Sound Forge», «Band-in-a-Box» выступают активизирующим средством эмоционального и психомоторного внутриутробного развития будущего ребенка, а также совершенствования культуры музыкального восприятия матери и плода.

ЛИТЕРАТУРА

1. Петрушин В. И. Музыкальная психотерапия: Теория и практика: Учебное пособие для студ. высш. учеб. заведений. М., 2000.

***Kovalevskaya A. A.***

*PREGNANT FEMALE STUDENTS' MUSICAL PERCEPTION CULTURE DEVELOPMENT IN THE HIGH SCHOOL*

*The creation of the musical-aesthetic environment for pregnant women — students as a condition of development of musicality of their future children in the intra-uterine period will: a) preserve their health; b) stimulate cognitive, emotional and psychomotor intra-uterine development of the future child; c) physically and psychologically preparate them for delivery by means of art; d) develop their culture of musical perception.*

## ВЫВУЧЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК: АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫЯ ПЫТАННІ

**Зыгмантовіч С. В.,**
**загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў**

Пошук шляхоў павышэння эфектыўнасці і якасці набывае асобую значнасць у сучасных умовах для ўсіх абласцей сацыяльнай дзейнасці, у тым ліку і для бібліяграфічнай. Актуальнасць вывучэння эфектыўнасці абумоўлена цэлым радам фактараў: небходнасцю інтэнсіфікацыі бібліяграфічнай дзейнасці; узмацненнем ролі асэнсаванага і планамернага кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю; укараненнем у работу бібліятэк эканамічных метадаў гаспадарання і неабходнасцю вызначэння сабекошту і цаны бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, важнасцю ацэнкі ўклада кожнага бібліятэкара-бібліёграфа ў дасягненне агульнай мэты; неабходнасцю параўноўваць эфектыўнасць функцыянавання розных бібліятэк, вызначаць аптымальныя формы і метады абслугоўвання на падставе вывучэння іх карыснасці; лабіраваць свае інтарэсы перад вышэйшымі суб'ектамі кіра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання і рабіць фінансаванне аргументаваным; неабходнасцю ацэньваць свае прадукты і паслугі па крытэрыях канкурэнтаздольнасці ва ўмовах развіцця інфармацыйнага рынка. Акрамя таго, вымярэнне эфектыўнасці работы і супастаўленне яго вынікаў з пастаўленымі мэтамі — адна з задач агульнага менеджмента якасці, сістэма якога сёння актыўна ўкараняецца ва ўсіх сферах як вытворчай, так і сацыяльна-культурнай дзейнасці.

На працягу многіх гадоў прыярытэтным для бібліятэк быў аналіз колькасных паказчыкаў работы. Агульнавядома, што менавіта ад вынікаў штогадовай дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці і сёння залежаць катэгарыяльнасць бібліятэкі і група па аплаце працы яе супрацоўнікаў.

Аднак сёння становіцца ўсё больш відавочным і неабходным правядзенне больш глыбокага аналізу дзейнасці як цалкам бібліятэк, так і складаючых іх падсістэм, да якіх адносіцца і бібліяграфічная служба бібліятэк, па крытэрыях і паказчыках эфектыўнасці і якасці іх работы. Як сведчыць міжнародная практыка, менавіта ў адпаведнасці з імі павінны вызначацца аб'ёмы фінансавання расходаў на ўтрыманне устаноў і забеспячэнне вытворчасці якасных і канкурэнтаздольных прадуктаў і паслуг. У той жа час, як адзначаюць распрацоўшчыкі міжнароднага кіраўніцтва па вымярэнню эфектыўнасці работы універсітэцкіх і іншых навуковых бібліятэк Розвіта Полл і Петер те Боккхорст, і «бібліятэкі, як і іншыя арганізацыі — правайдеры паслуг, павінны ўмець даказваць, што выдзеленыя ім сродкі выкарыстоўваюцца на выкананне правільна сфармуляваных мэт і задач найбольш эфектыўным чынам, што яны прапаноўваюць паслугі высокай якасці» [1, с.13], г. зн. бібліятэкі павінны валодаць інструментарыем і праводзіць спецыяльныя даследаванні па вывучэнні эфектыўнасцю сваёй дзейнасці.

У розныя часы ў розных краінах спецыялісты прыкладалі шмат намаганняў для вызначэння крытэрыяў ацэнкі эфектыўнасці работы розных устаноў. Засноўваліся яны пераважна на распрацоўках у сферы менеджмента якасці, якія запазычваліся з розных відаў, тыпаў арганізацый, незалежна ад галін і сфер дзейнасці.

Сёння аналіз спецыяльнай літаратуры дае нам падставы канстатаваць, што шмат чаго зроблена на тэарэтычным узроўні ў плане вывучэння эфектыўнасці бібліяграфічнай дзейнасці. Прымяненне сістэмна-дзейнаснага падыходу да разгляду бібліяграфічнай дзейнасці дазволіла вызначыць само паняцце эфектыўнасці бібліяграфічнай дзейнасці як сацыяльнай сістэмы, пад якім разумецца інтэгральная характарыстыка, звязаная з дасягненнем галоўнай мэты гэтай дзейнасці — задавальненне бібліяграфічных (дакументальных, інфармацыйных) патрэбнасцей карыстальнікаў (грамадства цалкам) у суадносінах з выкарыстоўваемымі сродкамі. Вызначаны асноўныя віды эфектыўнасці бібліяграфічнай дзейнасці (знешняя і ўнутраная, сацыяльная, эканамічная, арганізацыйная, тэхналагічная); узроўні яе праяўлення; падыходы да яе вывучэння; фактары, якія ўплываюць на яе ажыццяўленне; прапанаваны вымяральнікі эфектыўнасці — сістэма крытэрыяў і паказчыкаў. Найбольш плённа ў гэтым кірунку працуюць такія спецыялісты, як М. Г. Вохрышава, І. Р. Маргенштэрн, Н. М. Барская, Г. Г. Калініна, бібліятэказнаўцы М. С. Карташоў, Ю. М. Сталяроў, М. Я. Дворкіна, Е. А. Фенелонаў і інш.

Міжнародная практыка прадстаўляе таксама дастаткова шырокі спектр падыходаў і методык вызначэння якасных паказчыкаў работы бібліятэк і іх аналізу. Пад эгідай Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў (ІФЛА) рэалізаваны некалькі праектаў, вынікам якіх з'явіліся вельмі значныя і карысныя для бібліятэчных спецыялістаў дапаможнікі, такія, як «Оценка эффективности работы публичных библиотек» (проект пособия, подготовленный Н. Муром) [2] і «Измерение качества работы. Международное руководство по измерению эффективности работы университетских и других научных библиотек» [1]. У мэтах гарманізацыі прынцыпаў і практыкі ацэнкі работы бібліятэк ІСО ТК 46/SC8 (падкамітэт Міжнароднай арганізацыі па стандартызацыі, адказны за бібліятэчную статыстыку) падрыхтаваў Міжнародны стандарт «ISO 11620 Информация и документация. Показатели эффективности работы библиотек» [цыт. па 3]. У стандарце вызначаны агульныя патрабаванні да паказчыкаў работы бібліятэк, што выкарыстоўваюцца для ацэнкі эфектыўнасці выканання задач, пастаўленых перад канкрэтнай бібліятэкай; указаны ўмовы выбару і прымянення паказчыкаў; даны азначэнні і апісанні 30 паказчыкаў, якія характарызуюць задаволенасць карыстальнікаў,

выкананне грамадска значных функцый (ахоп насельніцтва, кошт абслугоўвання, паўната фондаў, аператыўнасць абслугоўвання і інш.), якасць тэхналагічных працэсаў.

На жаль, у нашай краіне сёння такіх агульнарэспубліканскіх нарматыўных дакументаў, кіраўніцтваў няма, шырока не знаёмая наша бібліятэчная грамадскасць з Міжнародным стандартам ІСО 11620. Стандарты ISO не з'яўляюцца такімі ж даступнымі, як дакументы ІФЛА. Іх распаўсюджаннем і ўкараненнем займаюцца нацыянальныя арганізацыі — паўнапраўныя члены Міжнароднай арганізацыі па стандартызацыі. У Беларусі — гэта БелДІІС. Членства ў ІСО дае права атрымліваць усе выданыя ёю стандарты, прымаць іх як аснову для беларускіх стандартаў. У 1996 г. у Беларусі быў заснаваны тэхнічны камітэт па бібліятэказнаўстве, які мае права вызначаць, якія стандарты ІСО, неабходныя ў бібліятэчнай дзейнасці, трэба прымаць у якасці беларускіх. Між тым дзейнасць яго не носіць сёння актыўнага характару. Задачу набыцця гэтага стандарта і яго вывучэння паставіў перад сабой у планах 2007 г. Камітэт па нарматыўна-рэгламентуючай дакументацыі ББА [4].

Не надаецца ў беларускім бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве дастаткова ўвагі і пытанням распрацоўкі і ўкаранення сістэмы менеджмента якасці. Вопыт лідзіруючых арганізацый сведчыць аб залежнасці іх поспеху ад таго, што ў цэнтр іх канкурэнтнай стратэгіі была пастаўлена арыентацыя на якасць праз стварэнне ўласнай сістэмы менеджмента якасці. Мала намаганняў прыкладаецца і для стымулявання працоўных рэсурсаў бібліятэк, іх своечасовага знаёмства з міжнароднымі дакументамі, авалодання імі інструментарыем і методыкай ацэнкі ўнутрыбіб-ліятэчных сістэм.

Сучасная бібліятэка — гэта суб'ект рынка, на які распаўсюджваюцца ўсе законы рынкавай эканомікі. Бібліятэка, як і любое іншае прадпрыемства, арганізацыя, павінна арыентавацца першнаперш на карыстальніка. Для гэтага ў бібліятэках сёння створаны і дастаткова паспяхова ў большасці бібліятэк функцыянуюць аддзелы маркетынга, якія скіравалі сваю дзейнасць на вывучэнне рынка інфармацыйных паслуг, патрабаванняў сучасных карыстальнікаў, рэкламную дзейнасць, устанаўленне сувязей з грамадскасцю. Каб выйсці на больш высокі ўзровень прадстаўлення якаснай інфармацыі і задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў, неабходна распрацоўка і паступовае ўкараненне сістэмы менеджмента якасці ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі ІСО серыі 9000 — «Стандарты в области административного управления качеством и обеспечения качества».

Універсальнасць гэтых стандартаў заключаецца ў тым, што яны не прапаноўваюць абсалютных вымяральных крытэрыяў якасці для кожнага віда прадукцыі і аказваемых бібліятэчна-бібліяграфічных паслуг, а задаюць метадалогію функцыянавання сістэмы якасці, якая, у сваю чаргу, павінна забяспечваць высокую якасць прадукцыі і паслуг, якія прапаноўвае арганізацыя, забяспечыць высокую ступень задаволенасці карыстальнікаў.

Такім чынам, вывучэнне эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк і павышэнне якасці бібліятэчна-бібліяграфічных паслуг павінны разглядацца як стратэгічныя напрамкі развіцця бібліятэк.

## ЛІТАРАТУРА


1. Полл Р. Измерение качества работы: Международное руководство по измерению эффективности работы университетских и других научных библиотек / Пер. с англ. И. В. Соколовой. М., 2002.
2. Оценка эффективности работы публичных библиотек: Проект пособия, подготовленный Н. Муром. М., 1990.
3. Сапрыкин Г. Стандартизация качественных показателей обслуживания в библиотеке // Бібліотечный форум України. 2004. № 4. С. 14—17.
4. Проект плана Совета Белорусской библиотечной ассоциации на 2007 год. Мн., 2006.



***Zygmantovich S. V.***


*THE INVESTIGATION OF THE EFFECT OF BIBLIOGRAPHICAL WORK IN LIBRARIES: ORGANIZATION AND METHODICAL ISSUES*


*In the article the effect of bibliographical work in libraries is studied, the state of scientific development of this problem is overviewed, provision with international standards and instructions is examined. The problems of organization and their introduction into the work of belarusian libraries are established: the necessity to extend the functions of the marketing department, the studying of the system of management's quality in libraries.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ